ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985

20

ЧЭРВЕНЯ

ЧАЦВЕР

№ 23 (1473)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

ТЭЛЕТАЙП

ЎЧОРА · СЁНЯ · ЗАЎТРА

АДЗІНЫ ПАЛІТДЗЕНЬ

праведзены на ўсіх факультэтах і ў падраздзяленнях БДУ імя У. І. Леніна. Тэма яго — «Цвярозасць — норма жыцця».

І. УЛАДЗІМІРАЎ.

СТАН ЛЕКЦЫЙНАЙ ПРАПАГАНДЫ

на біялагічным факультэце абмеркаваны на чарговым пасяджэнні бюро парткома. З дакладам выступіў сакратар партбюро біяфака У. М. Чарнагузаў.

Былі зацверджаны таксама камандзіры і камісары студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

НА СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ

рэктарата і камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна з паведамленнем аб гатоўнасці СБА універсітэта да летняга працоўнага семестра 1985 года выступіў прарэктар па вячэрняму і завочнаму навучанню Л. М. Давыдзенка.

А. ПАДАЛКА.

СТАРОНКУ ГІСТОРЫІ

Вялікай Айчыннай вайны, якую ўпісалі воіны легендарнага 2-га Гвардзейскага танкавага корпуса, адкрылі для сябе слухачы падрыхтоўчага аддзялення на сустрэчы, прысвечанай 41-й гадавіне вызвалення г. Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сардэчна віталі прысутныя гасцей: У. І. Кужалева, М. П. Юдзіна, М. П. Чайку, В. Я. Маленку, В. Р. Бялькевіча. Не маглі стрымаць хвалявання ветэраны, успамінаючы тыя страшныя дні. Ідучы з баямі, вызваляючы горад за горадам, вёску за вёскай, воіны не пазнавалі сваіх мясцін. Сэрца поўнілася помстай. І танкісты помсцілі, набліжаючы доўгачаканы Дзень Перамогі.

Усіх прысутных зацікавіла выстаўка кніг, якую арганізавалі супрацоўнікі аддзела масавай работы універсітэцкай бібліятэкі.

На сустрэчы слухачы прачыталі вершы, паказалі слайды.

А. МАКСІМАЎ,
слухач падрыхтоўчага аддзялення.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКЗАМЕН

...З АЎДЫТОРЫІ выйшаў малады чалавек. На яго дзеянні можна было зразумець, што «выпрабаванне» прайшло паспяхова. Ён павітаў таварышаў і выдыхнуў: «Усё!». Для Вячаслава Зайцава, студэнта-выпускніка вячэрняга аддзялення гістарычнага факультэта гэта быў апошні экзамен.

На маё пытанне: «Як адказваў Вячаслаў?» экзаменатар, дацэнт кафедры гісторыі КПСС У. І. Мядзянік адказаў коратка: «Выдатна!».

Заканчваюцца дзяржаўныя экзамены. Але не зусім радуе гэта выпускніка: хутка развітвацца з факультэтам, універсітэтам.

НА ЗДЫМКАХ: на гістарычным факультэце ідзе экзамен па гісторыі КПСС. Члены дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі задаволены адказамі студэнтаў. У большасці выпадкаў выпускнікі паказваюць высокі ўзровень ведаў. А гэта значыць, што плённа прайшлі гады вучобы ва універсітэце.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

ДЗЯКУЙ, УНІВЕРСІТЭТ!

НАЗАЎСЁДЫ Ў МАІМ СЭРЦЫ

ПРОЙДЗЕ яшчэ некалькі дзён, і я вярнуся ў родны В'етнам пасля пяці гадоў вучобы ў Мінску ў БДУ імя У. І. Леніна на факультэце журналістыкі. Вярнуся з дыпломам аб вышэйшай адукацыі, які мне пашчасціла атрымаць у сталіцы Беларусі. Але БДУ мне даў не толькі вышэйшую адукацыю і не толькі дыплом прывязу я дамоў — са мной назаўсёды застануцца дабрата, спагадлівасць мінчан.

...Пяць гадоў назад пасля заканчэння падрыхтоўчага факультэта пры МДУ па накіраванню нашага пасольства я ехаў у новы, незнаёмы горад.

Тут я сустрэў людзей, у якіх вучыўся будучай спецыяльнасці. Яны былі для мяне не толькі выкладчыкамі, але і старэйшымі таварышамі, сябрамі. У Мінску я сустрэў і сваё шчасце. Тут было маё вяселле ў інтэрнаце № 2 на вуліцы Кастрычніцкай. Савецкія сябры, як заўсёды, былі са мною побач у гэтыя шчаслівыя гадзіны.

У пісьмах дамоў я пісаў, што Мінск стаў для мяне другім родным горадам. Я апісваў прыгажосць Масквы, Ленінграда, Кіева, Харкава, Растова-на-Доне, Алма-Аты, Ташкента, Сімферопаля, у якіх я пабываў, але нязменна дадаваў, што мне хочацца хутчэй вярнуцца ў «мой Мінск».

Так, за гэтыя пяць гадоў Мінск стаў і маім горадам. Я радуюся кожнаму новаму дому, кожнай новай вуліцы, Мінскаму метро. І калі думаю пра тое, што хутка паеду адсюль, то ўспамінаю нашага паэта Це Лан В'ена, які пісаў, што месцы, у якіх жыве чалавек, пасля таго, як ён іх пакідае, становяцца часцінкай яго душы. Раней Мінск быў далёка ад мяне па адлегласці, зараз ён будзе блізкім мне ў душы.

Я вяртаюся ў В'етнам, але Мінск, Беларусь, універсітэт я ніколі не забуду. Я гавару: «Да пабачэння! Да новай сустрэчы!»

ЗЫОНГ СУАН ШОН.
выпускнік факультэта журналістыкі.

КАНФЕРЭНЦЫЯ

РУСІСТЫ РАЯЦЦА

НА ПРАЦЯГУ чатырох дзён у БДУ імя У. І. Леніна праходзіла рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя «Роля і месца тэксту па спецыяльнасці ў навучанні замежных студэнтаў», арганізаваная Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Беларускім рэспубліканскім метадычным аб'яднаннем выкладчыкаў рускай мовы як замежнай і кафедрай рускай мовы па навучанню замежных студэнтаў універсітэта. Было пададзена 123 даклады і паведамленні з 25 гарадоў Савецкага Саюза: Масквы, Ленінграда, Кіева, Мінска, Ташкента, Ерэвана, Тбілісі, Кішынёва, Данецка, Адэсы, Харкава, Запарожжа, Крывога Рога, Валгаграда, Краснадара, Іркуцка і інш.

Канферэнцыю адкрыў рэктар універсітэта акадэмік АН БССР І. І. Кавалёўскі.

У рабоце канферэнцыі прымалі ўдзел вучоныя з ЧССР — прарэктар Педагагічнага інстытута г. Нітры кандыдат філалагічных навук, дацэнт Міхаіл Рогаль і загадчыца кафедры рускай мовы вышэйшай сельскагаспадарчай школы гэтага горада, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Э. Глушкова, якія абмяняліся вопытам работы, расказалі аб вывучэнні рускай мовы ў школах і вышэйшых навучальных установах Чэхаславакіі.

Цёпла сустрэлі ўдзельнікі канферэнцыі выступленне намесніка міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР С. А. Малевіча, які адзначыў высокі навукова-тэаратычны і метадычны ўзровень многіх дакладаў і паведамленняў, шырокае асвятленне пытанняў, звязаных з прыёмамі і метадамі інтэнсіфікацыі вучэбнага працэсу па рускай мове як замежнай. У рабоце канферэнцыі прыняў удзел інструктар ЦК КПБ Я. І. Бараноўскі.

Удзельнікі канферэнцыі наведалі кафедры рускай мовы вышэйшых навучальных устаноў Мінска, азнаёміліся з іх вопытам вучэбна-метадычнай работы, а таксама пабывалі ў Хатыні і на Кургане Славы.

В. РАВІЦКІ,
загадчык кафедры рускай мовы па навучанню замежных студэнтаў, дацэнт.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

КАНТРОЛЮ–ДЗЕЙСНАСЦЬ

ПАРТЫЙНЫ КАНТРОЛЬ, які з'яўляецца зараз неад'емнай часткай арганізатарскай работы партыі, прайшоў вялікі шлях пошуку, станаўлення і развіцця. Ля вытокаў яго стаяў У. І. Ленін. Ён сфармуляваў асноўныя прынцыпы кантролю — усеагульнасць, сістэматычнасць, масавасць, галоснасць і дзейснасць, на аснове якіх партыя на кожным гістарычным этапе выпрацоўвае канкрэтныя патрабаванні да ажыццяўлення кантролю.

З мэтай далейшага ўзмацнення адказнасці і павышэння актыўнасці пярвічных партыйных арганізацый, паляпшэння іх арганізатарскай і выхаваўчай работы ў калектывах працоўных XXIV з'езд партыі прызнаў мэтазгодным распаўсюдзіць палажэнне Статута КПСС аб праве кантролю за дзейнасцю адміністрацыі і на пярвічныя партыйныя арганізацыі навучальных устаноў.

Роля камісій яшчэ больш узрасла ў святле задач, пастаўленых перад партыйнымі арганізацыямі XXVI з'ездам КПСС па ўмацаванню дзяржаўнай дысцыпліны, павышэнню адказнасці службовых асоб за даручаную ім справу, за выкананне планаў і заданняў XI пяцігодкі. Цэнтральны Камітэт КПСС у лютым 1982 года прыняў Пастанову «Аб камісіях пярвічных партыйных арганізацый па ажыццяўленню кантролю за дзейнасцю адміністрацыі і за работай апарату». Гэтай жа пастановай зацверджана новае палажэнне аб камісіях, у якім вызначаны іх задачы, правы і абавязкі, парадак утварэння і справаздачнасці.

У чым жа сутнасць права кантролю за дзейнасцю адміністрацыі?

Па-першае, права палітычна аналізаваць змест і накіраванасць прымаемых адміністрацыяй рашэнняў, адпаведнасць іх агульнаму палітычнаму курсу партыі.

Па-другое, права ацэньваць агульны стан спраў, магчымасці, характар выкарыстання рэзерваў з наступным аказанням дапамогі кадрам і актыву, павышэннем іх прафесійнага майстэрства, каб яны маглі паспяхова вырашаць пастаўленыя задачы.

Па-трэцяе, права кантролю прадугледжвае вызначэнне крыніц і ўмоў узнікнення недахопаў, іх канкрэтных віноўнікаў, ступені адказнасці, а таксама шляхоў ліквідацыі памылак і недапрацовак.

Паралельна ўзнікае пытанне аб саставе адміністрацыі ВНУ. Ад слова «адміністрацыя» неабходна адрозніваць слова «кіраўніцтва», якое з'яўляецца састаўной часткай адміністрацыі. Кіраўніцтва — гэта рэктар, прарэктары, якія з'яўляюцца вышэйшым узроўнем арганізацыі кіравання ВНУ. Другім узроўнем кіравання з'яўляецца кіраўніцтва структурных падраздзяленняў — дэканы факультэтаў, дырэктары інстытутаў, кіраўнікі іншых унутрывузаўскіх падраздзяленняў і іх намеснікі. Пярвічны узровень — кіраўнікі кафедраў і іншых нізавых ячэек унутрывузаўскіх падраздзяленняў (загадчыкі лабараторый і сектараў).

Камісіі павінны своечасова зауважаць і падтрымліваць усё новае, прагрэсіўнае, унікаць у пытанні расстаноўкі і выхавання кадраў, паляпшэння ўмоў працы і быту людзей, сачыць за строгім захаваннем дзяржаўнай, планавай і тэхналагічнай дысцыпліны, павышаць адказнасць работнікаў за даручаную справу, развіваць ініцыятыву і прынцыповасць камуністаў, рашуча выступаць супраць безгаспадарчасці, марнатраўства, пажывы за дзяржаўны кошт, вескі бескампрамісную барацьбу з фактамі нядобрасумленных адносін да выканання службовых абавязкаў, бюракратызму і валакіты, ашуканства, месніцтва і вузкаведамаснага падыходу. Камісіі не з'яўляюцца нейкім асобым кантрольным органам, які існуе паралельна з партыйнай арганізацыяй. Яны з'яўляюцца адной з арганізацыйных форм выкарыстання пярвічнай арганізацыяй права кантролю за дзейнасцю адміністрацыі і за работай апарату. Дзейнічаюць пад кіраўніцтвам партыйных камітэтаў, партбюро, сакратароў партарганізацый і падсправаздачныя ім. Не камісіі, а партыйная арганізацыя, абапіраючыся на іх матэрыялы, вырашае, якія меры ўздзеяння прыняць да таго ці іншага кіраўніка за недахопы і ўпушчэнні ў рабоце.

Пярвічная партарганізацыя, яе выканаўчы орган — партком, партбюро — могуць заслухоўваць справаздачы кіраўнікоў, знаёміцца з адпаведнымі дакументамі, выказваць свае меркаванні па пытаннях кіраўніцтва, рэкамендацыі ў адпаведнасці з партыйнымі дакументамі і савецкімі законамі, узнімаць пытанні, звязаныя з работай адміністрацыі, апарату кіравання перад вышэйстаячымі партыйнымі і гаспадарчымі органамі. Канкралюючы дзейнасць адміністрацыі, ставячы перад ёй тыя ці іншыя пытанні, партыйныя арганізацыі дапамагаюць іх вырашаць, дзейнічаючы разам з кіраўнікамі.

Партыйныя арганізацыі падыходзяць да ўтварэння той ці іншай камісіі з пункту гледжання інтарэсаў справы, сапраўднай неабходнасці ў ажыццяўленні кантролю на тым ці іншым участку работы. Было б няправільным лічыць, напрыклад, стварэнне ў вялікіх партарганізацыях камісіі, на якую цалкам ускладваецца кантроль за дзейнасцю адміністрацыі. Камісіі толькі тады ў стане сур'ёзна дапамагчы партыйнай арганізацыі, калі іх стварэнне для работы па канкрэтных праблемах, дакладна вызначаных напрамках. Партыйныя арганізацыі павінны паўсядзённа кіраваць іх работай, падтрымліваць слушныя прапановы, вучыць членаў камісіі практыцы кантролю.

Ва універсітэце пры парткоме зараз працуюць тры камісіі кантролю за дзейнасцю адміністрацыі: камісія кантролю за дзейнасцю адміністрацыі па вучэбнай рабоце (старшыня М. Талочка), па навуковай рабоце (старшыня Т. Шпакоўскі), па гаспадарчай дзейнасці (старшыня А. Чупрыгін). На наш погляд, такое раздзяленне камісій з'яўляецца нямэтазгодным. Найбольш эфектыўнай работа можа быць пры ўмове, калі ўсе гэтыя камісіі будуць аб'яднаны пад адным старшынствам, а ў іх будуць адказныя за пэўныя напрамкі работы.

Камісіі ўтвараюцца, як правіла, партыйнымі сходамі ці канферэнцыямі на тэрмін паўнамоцтваў партыйнага камітэта або партыйнага бюро. Пры неабходнасці партыйныя сходы на працягу справаздачнага перыяду могуць ствараць новыя ці пераглядаць састаў існуючых камісій.

Колькасны і асабовы састаў камісіі вызначаецца ў залежнасці ад аб'ёму і характару ўскладзенай на іх работы. Выбары членаў камісій праводзяцца адкрытым галасаваннем. У іх састаў уключаюцца члены і кандыдаты ў члены КПСС. Камуністаў, якія павінны адказваць за стан спраў на тым участку, дзе ствараюцца камісіі, рэкамендаваць у іх састаў не мае сэнсу.

Камісіі трымаюць справаздачу аб сваёй дзейнасці на справаздачна-выбарных партыйных сходах або канферэнцыях, акрамя таго, не менш аднаго разу ў год перад агульным сходам камуністаў, партыйным камітэтам ці партбюро. Ва ўсіх выпадках даецца ацэнка работы камісій і вызначаюцца напрамкі іх дзейнасці.

Што датычыцца вынікаў разгледжання канкрэтных пытанняў, то камісіі абагульняюць іх і падаюць у пісьмовым выглядзе у партком або партбюро падраздзяленняў, а пры неабходнасці выносяць пытанні на абмеркаванне на партыйных ці вытворчых сходах, пасяджэннях, нарадах.

Партыйныя арганізацыі не толькі самі ажыццяўляюць кантроль за дзейнасцю адміністрацыі, але і кіруюць усімі відамі кантролю, вытворча-масавымі камісіямі прафсаюзных арганізацый, аказваюць паўсядзённую дапамогу групам і пастам народнага кантролю, парткамісіі.

Задача партыйных арганізацый — забяспечваць адзінства і ўзгодненасць дзеянняў усіх форм партыйнага і грамадскага кантролю, не дапускаць нагрувашчвання рознага роду праверак. Планы работы павінны абмяркоўвацца на пасяджэннях парткома і партбюро з удзелам актывістаў, якія потым будуць працаваць у саставе гэтых камісій.

Л. ПАЎЛОВІЧ,
намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце.

САЛЮТ, ФЕСТЫВАЛЬ!

«Я быў яго ўдзельнікам...»

У жыцці Фёдара Васільевіча Чумакова, дацэнта кафедры тэорыі функцый механіка-матэматычнага факультэта, была падзея, якая засталася ў памяці на ўсё жыццё,— VI Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў у Маскве і III Сусветныя гульні студэнтаў 1957 года. Мы папрасілі Фёдара Васільевіча падзяліцца ўспамінамі.

— Фёдар Васільевіч, як праходзіла падрыхтоўка да фестывалю ў нашай рэспубліцы?

— Правядзенне фестывалю ў сталіцы нашай Радзімы Маскве стала важнай падзеяй у жыцці моладзі краіны. Усюды па рэспубліцы праходзілі вечары, асноўная тэма якіх супадала з дэвізам фестывалю: «За мір, дружбу!».

— Адначасова з падрыхтоўкай да фестывалю ішла падрыхтоўка і да III Сусветных гульняў студэнтаў. Вы былі ў саставе дэлегацыі спартсменаў сталіцы нашай рэспублікі.

— У спартыўных спаборніцтвах прымала ўдзел каля 500 студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Мінска. Асноўную групу складалі студэнты Інстытута фізкультуры, былі тут і студэнты універсітэта. Як правіла, гэта былі тыя, хто добра вучыўся, а таксама быў добрым спартсменам.

Я добра помню тую Маскву, святочную, у прыгожым убранстве. Шары, кветкі, фестывальныя эмблемы, значкі, галубы і ўсмешкі, шчырыя сяброўскія ўсмешкі зусім незнаёмых людзей. І тады я адчуў, што моладзь — гэта вельмі вялікая сіла.

Сустракаліся зусім незнаёмыя людзі, але фестывальная Масква збліжала іх у адзінстве думак і імкненняў. Ідзеш па гораду і зусім нечакана можаш апынуцца на канцэрце. Канцэрты пад адкрытым небам — яшчэ адна адметная рыса фестывальнай Масквы. І ўсё ж самым напружаным быў дзень нашага выступлення. Хіба магчыма перадаць той настрой, які ахапіў усіх удзельнікаў нашай дэлегацыі, калі нам патрэбна было выступаць на стадыёне ў Лужніках. Ад кожнага з нас, ад нашых зладжаных дзеянняў залежала ўсё выступленне. На нас глядзела моладзь Масквы, моладзь краіны, моладзь свету. І ўжо потым, калі глядзелі свае выступленні па тэлевізару, самі былі прыемна здзіўлены, наколькі яны былі прыгожымі, уражваючымі. І нездарма нашай дэлегацыі была выказана вялікая падзяка, многія ўдзельнікі былі ўзнагароджаны граматамі.

Самыя добрыя пачуцці, самыя лепшыя ўспаміны пакінуў пасля сябе фестываль. Мы ад'язджалі з Масквы шчаслівымі: цудоўна прайшоў тут час. Мы былі ўпэўнены, што і ўсім замежным гасцям спадабаліся наша сталіца, наш фестываль. Мы ад'язджалі поўныя надзей міру і дружбы паміж моладдзю ўсіх краін. Як гэта добра, што надзеі нашы збыліся, а сведка гэтага — фестываль, які пройдзе ў гэтым годзе зноў у Маскве.

Запісала
М. ШЧАРБАКОВА.

ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ праведзена вучоба партгрупоргаў. На ёй адзначаны станоўчы вопыт, назапашаны партгрупай кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў.

НА ЗДЫМКУ: партгрупорг кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў В. С. Сцепін і камуністы кафедры абмяркоўваюць меры па ўзмацненню ролі партгрупы ў жыцці калектыву.

ЗА РАДКОМ ШКОЛЬНАЙ РЭФОРМЫ

ГАЛОЎНАЕ ЗВЯНО

Сумесная работа школы, сям'і і грамадскасці — неабходная ўмова паспяховага выхавання падрастаючага пакалення. Сувязь школы з сям'ёй, бацькамі вучняў — галоўнае звяно ў данай рабоце. Асабліва вялікая тут роля класнага кіраўніка і настаўніка.

У ВНУ, якія рыхтуюць настаўнікаў, асабліва ва універсітэтах, няма дакладнай сістэмы падрыхтоўкі студэнтаў — будучых настаўнікаў — да работы з бацькамі. Так, напрыклад, у праграме педагагічнай практыкі студэнтаў нашага універсітэта не гаворыцца аб тым, што практыканты абавязаны наведваць бацькоўскі дома, а таксама бацькоўскія сходы, выступаць на іх з лекцыямі і дакладамі, пазнаёміцца з работай бацькоўскага камітэта. Гэтай праблеме не ўдзяляецца ўвагі і ў час праходжання студэнтамі педагагічнай і піянерскай практык.

Распрацоўка сістэмы актыўнай падрыхтоўкі студэнтаў універсітэта да работы з бацькамі вучняў з'яўляецца вельмі важнай і актуальнай. У гэту сістэму ўваходзяць: сумесны кантроль і дапамога дзецям у іх вучэбнай рабоце, сумесная работа сям'і, класных кіраўнікоў і настаўнікаў па маральнаму, прававому, эстэтычнаму, фізічнаму выхаванню дзяцей; работа бацькоўскіх камітэтаў; правядзенне класных і школьных бацькоўскіх сходаў і інш. Сістэма актыўнай падрыхтоўкі студэнтаў да работы з бацькамі павінна ажыццяўляцца ў працэсе вучэбнай і выхаваўчай работы ва універсітэце (лекцыі, семінарскія заняткі, спецкурсы, педагагічныя атрады, педагагічныя гурткі, грамадска-палітычная практыка і інш.), а таксама ў час праходжання педагагічнай і піянерскай практык.

Адным з важных шляхоў падрыхтоўкі студэнтаў з'яўляецца вывучэнне педагогікі і педагагічных спецкурсаў. Студэнт, які добра ведае курс педагогікі, лягчэй і больш упэўнена ўступае ў кантакт з бацькамі, каб аб'яднаць намаганні для павышэння якасці выхавання і навучання дзяцей. Неабходна больш цесна ўвязваць курс лекцый па педагогіцы з практычным вырашэннем задач камуністычнага выхавання школьнікаў. Студэнты яшчэ ў перыяд вучобы ва універсітэце павінны далучацца да актыўнага ўдзелу ў працоўным і маральным выхаванні вучняў, рыхтаваць сябе да выканання складаных функцый настаўніка і класнага кіраўніка. На гэта нацэльваюць нас «Асноўныя напрамкі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы». Цяжка пераацаніць ролю спецкурса «Методыка работы класнага кіраўніка», які дазваляе студэнтам зразумець сутнасць і змест работы класнага кіраўніка, яго вялікай адказнасці за ажыццяўленне арганічнай сувязі школы з сям'ёй, бацькамі вучняў. Зараз важнай задачай кафедры педагогікі з'яўляецца далейшае ўдасканаленне зместу і практычнай значнасці данага спецкурса. Большую частку практычных заняткаў мэтазгодна было б перанесці ў школы.

Глыбокае вывучэнне і веданне студэнтамі зместу работы з бацькамі вучняў — важная ўмова павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў-настаўнікаў з універсітэцкай адукацыяй.

У. МЕШЧАРАКОЎ,
дацэнт кафедры педагогікі.

ШЧЫРА ВІНШУЕМ!

Паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі:

К. У. ЮМАШАЎ — НДІ ПФП, навуковыя кіраўнікі доктар фізіка-матэматычных навук **М. І. Дзямчук**, кандыдат фізіка-матэматычных навук **В. П. Міхайлаў**;

І. А. ХАРТОНІК — НДІ ПФП, навуковыя кіраўнікі доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар **Д. С. Умрэйка**, старшы навуковы супрацоўнік **Г. Г. Навіцкі**;

А. І. ХМЯЛЬНІЦКІ — фізфак, навуковыя кіраўнікі прафесар **А. І. Камяк**, дацэнт **С. Н. Чаранкевіч**;

М. А. ДРАЗДОЎ — фізфак, навуковыя кіраўнікі прафесар **В. Д. Ткачоў**, дацэнт **А. А. Патрын**;

Б. Б. ВІЛЕНЧЫЦ — НДІ ПФП, навуковыя кіраўнікі прафесар **Д. С. Умрэйка**, дацэнт **Д. А. Ашкінадзе**;

І. М. ЗАВЕЛА — механіка-матэматычны факультэт, навуковы кіраўнік дацэнт **А. А. Кілбас**;

В. Х. КАВАЧОЎ — ФПМ, навуковы кіраўнік прафесар **Ю. С. Багданаў**;

Я. Д. КАРЫХ — факультэт радыёфізікі і электронікі, навуковы кіраўнік дацэнт **А. Ф. Шылаў**;

КАМАРА МАМАДУ САНУСІ — фізфак, навуковы кіраўнік дацэнт **В. Ф. Стэльмах**;

С. В. ПРАЦКО — НДІ ПФП, навуковы кіраўнік дацэнт **А. П. Хапалюк**;

С. І. МАКСІМАЎ — факультэт радыёфізікі і электронікі, навуковы кіраўнік прафесар **А. М. Шырокаў**;

Я. Л. ТРАМБАВОЛЬСКІ — філфак, навуковы кіраўнік прафесар **А. Я. Супрун**;

А. М. КАЛЮТА — філфак, навуковы кіраўнік прафесар **А. Я. Супрун**;

У. С. ГУСАРАЎ — кафедра гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў, навуковы кіраўнік прафесар **Д. П. Жмуроўскі**.

В. У. ЛІТВІНАЎ — фізфак, навуковы кіраўнік дацэнт **В. І. Урэнёў**;

Г. Р. ЧАЕЎСКІ — механіка-матэматычны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **Э. І. Звяровіч**;

З. М. ПІНХАСІК — кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, навуковы кіраўнік прафесар **М. Г. Юркевіч**;

Г. А. САКОЛІК — НДІ ФХП, навуковы кіраўнік прафесар **В. В. Свірыдаў**;

М. В. ШЫШОНАК — НДІ ФХП, навуковы кіраўнік прафесар **Ф. М. Капуцкі**;

Г. С. ПЯТРОЎ — НДІ ФХП, навуковы кіраўнік прафесар **А. А. Вечар**;

А. І. ВРУБЛЕЎСКІ — НДІ ФХП, навуковы кіраўнік дацэнт **Ю. В. Глазкоў**;

Н. У. КУІШ — кафедра палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў, навуковы кіраўнік прафесар **У. А. Кулажанка**.

Жадаем новых творчых поспехаў!

ПРАЙШЛА вучоба намеснікаў сакратароў партбюро па арганізацыйнай рабоце. На ёй падведзены вынікі справаздач і выбараў на факультэтах і ў падраздзяленнях, разгледжаны функцыянальныя абавязкі намеснікаў сакратароў партбюро, абмеркаваны пытанні справаводства і кантролю за выкананнем рашэнняў. На вучобе выступілі загадчыца агульнага аддзела РК КПБ І. В. Краснеўская. намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце Л. А. Паўловіч, загадчык падрыхтоўчага аддзялення, член парткома В. У. Красна прошын.

НА ЗДЫМКУ: у час вучобы намеснікаў сакратароў партбюро па арганізацыйнай рабоце.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

У КАМІТЭЦЕ ДТСААФ

РЫХТАВАЦЬ СПАРТСМЕНАЎ І ГРАМАДЗЯН

ДТСААФ нашага універсітэта налічвае каля 12 тысяч студэнтаў і выкладчыкаў. Многія з іх займаюцца ў спартыўных секцыях, якіх пры таварыстве створана каля 60. Асабліва добра наладжана работа ў секцыях кулявой стральбы. Толькі сярод першакурснікаў за апошнія месяцы 80 чалавек атрымалі разрады па гэтаму віду спорту. А па ваенна-прыкладному дваябор'ю 116 чалавек сталі разраднікамі.

Неабходна заўважыць, што значна палепшылася якасць падрыхтоўкі спартсменаў па ваенна-прыкладных відах спорту. Калі ў мінулым годзе было падрыхтавана 232 разраднікі, то ў гэтым за першыя чатыры месяцы — 440.

Але работа ДТСААФ не абмяжоўваецца толькі падрыхтоўкай спартсменаў. Разам з іншымі грамадскімі арганізацыямі універсітэта яно займаецца ваенна-патрыятычным выхаваннем моладзі. Са студэнтамі праводзяцца шматлікія тэматычныя вечары, сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, урокі мужнасці, навукова-тэарэтычныя канферэнцыі.

Найбольш актыўна працуюць камітэты ДТСААФ фізічнага, біялагічнага, хімічнага, юрыдычнага факультэтаў. Актывістамі таварыства па праву можна назваць С. Волкава (фізфак), Б. Капытка (факультэт радыёфізікі і электронікі), У. Багданава (журфак), В. Скуратава (геафак).

І. РУСЕЦКАЯ,
К. ЧАПЛЯ,
студэнткі факультэта журналістыкі.

КАРТАЧНЫ ДОМІК

НЕКАЛЬКІ МАНАЛОГАЎ ЗАЦІКАЎЛЕНАГА ЧАЛАВЕКА

НАВОШТА ГЭТА ТРЭБА?

«ГЭТА» — матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне. Ім займаецца наш аддзел, які мае адпаведную назву. Аб важнасці справы сведчыць той факт, што амаль трэцяя частка прадукцыі, якая вырабляецца ў краіне, праходзіць праз сферу матэхзабеспячэння. Своечасовае задавальненне патрэб усіх падраздзяленняў універсітэта павышае эфектыўнасць вучэбнага працэсу, даследчай работы.

Нашу працу можна параўнаць з функцыяніраваннем буйнога чыгуначнага вузла. І аддзел забеспячэння тут як дыспетчарская, звязаная адначасова і з пастаўшчыкамі, і з заказчыкамі. Быць, як кажуць, між двума агнямі вельмі нялёгка. Гэта нараджае шмат праблем...

ЗАЦІКАВІЦЬ У АШЧАДНАСЦІ

У РАНГУ сваіх першачарговых задач аддзел лічыць забеспячэнне эканоміі ў выкарыстанні матэрыяльных рэсурсаў. Беражлівыя адносіны да абсталявання дазволяць падоўжыць перыяд яго эксплуатацыі, знізіць матэрыяльныя затраты на падрыхтоўку спецыялістаў і навуковыя даследаванні. На жаль, не ўсе супрацоўнікі універсітэта гэта разумеюць. І калі нейкая прылада выходзіць са строю, нават па нязначных прычынах, стараюцца хутчэй спісаць яе і атрымаць новую. Хаця рамонт каштаваў бы куды менш, а канчатковы вынік быў бы аднолькавы.

Многія нашы заказчыкі «хварэюць» празмернай запаслівасцю. Пры складанні заявак запрашваюць куды больш прылад, абсталявання, канцтавараў, мэблі і інш., чым патрабуецца на самай справе. Маўляў, калі палову патрэб забяспечаць, ужо добра. Мы ж, выканаўцы тых патрэб, стараемся зрабіць усё магчымае, каб факультэт, кафедра ці лабараторыя атрымалі ўсё, што неабходна. Такія чынам, на сённяшні дзень у многіх падраздзяленнях накапіліся такія запасы неўсталяваных прылад, канцтавараў, абсталявання, што з ліхвой хопіць на некалькі гадоў наперад.

Між тым ва універсітэце створана камісія з ліку адказных работнікаў, у абавязкі якой уваходзіць кантроль за рацыянальным выкарыстаннем матэрыяльных і паліўна-энергетычных рэсурсаў. Але, трэба думаць, працуе яна недастаткова актыўна. Ці не гэта з'яўляецца адной з прычын слабага выкарыстання наяўных рэзерваў?

Возьмем, напрыклад, аўтапарк універсітэта. Ён налічвае каля трыццаці машын. Эканомія гаруча-змазачных матэрыялаў, рацыянальнае выкарыстанне тэхнікі пакідаюць жадаць лепшага. А дастаткова толькі арганізаваць працу вадзіцеляў па метаду брыгаднага падраду, і многія праблемы будуць вырашаны.

Такіх прыкладаў, дзе ўдасканаленне форм арганізацыі працы, строгага ўліку і кантролю прынясе адчувальны вынік, прывядзе да відавочных зрухаў, нямала. Трэба толькі больш зацікаўленасці. Не толькі ў працы, але і ў эканоміі дапаможных сродкаў вучобы і працы.

«УСІМ СЯСТРЫЦАМ ПА ЗАВУШНІЦАХ»

ЕСЦЬ ТАКАЯ прымаўка. Як паказвае практыка, яе ўзялі за прынцып многія падраздзяленні універсітэта пры складанні заявак на абсталяванне, неабходнае для арганізацыі вучэбнага працэсу і навуковых даследаванняў. І не такі ўжо рэдкі выпадак, калі па адной і той жа патрэбе ў розных калектывах далёка не аднолькавыя нормы расходавання, якія, як ужо адзначалася, наўмысна завышаюцца. Тлумачыцца гэта адсутнасцю вызначаных норм патрэб у матэрыяльна-тэхнічных рэсурсах. Ужо сёння наспела неабходнасць неяк цэнтралізавана ўплываць на фарміраванне попыту нашых заказчыкаў. Магчыма нават аўтарытэтам вышэйназванай камісіі.

Афармленне і падача заявак, напэўна, самае балючае месца ва ўсёй сувязі заказчык — аддзел забеспячэння — пастаўшчык. У нас нямала прэтэнзій у гэтым плане да ўсіх падраздзяленняў універсітэта, апроч хіба што хімічнага факультэта. Заяўкі складаюцца неабгрунтавана, непрадумана, падаюцца не ў час. Пасля на працягу года высвятляецца, што забыліся заказаць тую ці іншую прыладу, будматэрыялы, сантэхабсталяванне і г. д. Пачынаюцца бясконцыя візіты прадстаўнікоў факультэтаў, уносяцца «карэктывы» у нашы планы. І яны тут жа рушацца, нібы картачны домік. Асабліва калі прыходзіць час «атаварвацца». За гады работы на пасадзе загадчыка аддзела не прыгадаю выпадку, каб усе нашы заяўкі задавальняліся поўнасцю. Калі вывесці сярэдні працэнт атрымліваемых матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў, будзе нешта каля 50—60 працэнтаў. Згадзіцеся, небагата, каб задаволіць усёўзрастаючыя патрэбы факультэтаў, кафедраў, лабараторый...

Частка віны ляжыць на падраздзяленнях, якія неакуратна афармляюць заяўкі. З-за гэтага аддзел не можа адразу і ў свой час запатрабаваць ад галоўнага пастаўшчыка ўсё неабходнае. А калі ўлічыць неразваротлівасць і неаператыўнасць сістэмы забеспячэння — малюнак сапраўднага становішча спраў будзе поўны.

ЭВМ... НАПРАКАТ

ТАК, НЕ ЗДЗІЎЛЯЙЦЕСЯ. Яшчэ на XXVI з'ездзе КПСС гаварылася аб неабходнасці стварэння міжгаліновых баз пракату машын і прылад, што дазволіць значна павысіць наменклатуру сучаснага абсталявання.

Гаворка ідзе аб пракаце як вузкаспецыяльных прылад, прыстасаванняў, так і самых прасцейшых механізмаў. Пішучых машынак, напрыклад.

Форма эксплуатацыі абсталявання даволі перспектыўная. Часам здараецца так, што нейкі аддзел спешна набывае ЭВМ, а пасля высвятляецца, што яна патрэбна толькі два разы ў год, на перыяд апрацоўкі інфармацыі. «Здаецца рабочы час...» — такія аб'явы сталі звычайнымі.

Пазбегнуць падобных накладак можна з дапамогай пракату. Карыстанне яго паслугамі значна аблягчае работу аддзела забеспячэння, павышае эфектыўнасць выкарыстання прылад. На жаль, большасць падраздзяленняў універсітэта ўсё яшчэ асцярожна апрабіруюць магчымасці пракату, працягваюць купляць дарагое абсталяванне, якое, здараецца, больш прастойвае, чым працуе.

КАЛІ Б Я МОГ...

НАПЭЎНА, у першую чаргу запрасіў бы на работу ў аддзел Старога Хатабыча ці якую яшчэ казачную персону з уласцівасцямі чараўніка, таму што знайсці дастойную кандыдатуру на пасаду забеспячэнца пры неабмежаваных клопатах і досыць невысокай аплаце працы вельмі нялёгка. Неўзабаве ўтвараецца вакансія. Звоняць з гэтай нагоды жадаючыя яе заняць часта і многа. Але як толькі даведаюцца аб памерах акладу і аб'ёме абавязкаў, адразу спяшаюцца ветліва развітацца.

Яшчэ, калі б я мог, знайшоў бы больш падыходзячыя складскія памяшканні. Тыя, што маюцца на сённяшні дзень, мала адпавядаюць сваім патрабаванням. Па-першае, з-за ненадзейнасці. У падвалах, дзе часцей за ўсё службы аддзела ўтрымліваюць канцтавары, прылады і іншае абсталяванне, уздоўж і ўпоперак працягнуты трубы сантэхнічнай сістэмы. Яны маюць асаблівасць часта выходзіць са строю, і наша маёмасць тады аказваецца, мякка кажучы, падмочанай.

Другая нязручнасць падвальных складоў — дадатковыя цяжкасці ў час пагрузкі і разгрузкі. Ці трэба спецыяльна тлумачыць, што сіламі аднаго штатнага грузчыка ажыццяўляць увесь грузаабарот няпроста, амаль немагчыма. Калі б на пасадзе знаходзіўся нават Геркулес...

Якім чынам забеспячэнцы перамяшчаюць матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы з аўтатранспарту ў склады — сакрэт «фірмы». І выдаваць яго, на маю думку, немэтазгодна.

Толькі работнікі нашага аддзела ведаюць, што такое студэнцкі інтэрнат. Асабіста мне ён уяўляецца таямнічымі чорнымі дзіркамі, не менш загадкавымі, чым на Сонцы. Штогод завозім незлічоную колькасць мэблі, бытавога інвентару. Куды ўсё гэта дзяецца, не змог бы адказаць і Шэрлак Холмс, заклікаўшы на дапамогу сваю славутую дэдукцыю.

А калі сур'ёзна — даўно час увесці строгі кантроль і справаздачнасць у студэнцкіх інтэрнатах. Гэта я таксама ажыццявіў бы, калі б мог. Але і дагэтуль у пакоях няма вопісу маёмасці. За што адказваюць старасты — невядома не толькі людзям староннім, але і ім самім.

Усё гэта так — для агульнага развіцця, як кажуць. Каб ведаць, аб чым марыць загадчык аддзела забеспячэння. А кожны мой працоўны дзень пачынаецца з сутыкнення з надзённай рэчаіснасцю. Я складаю картачны домік сваіх планаў, які тут жа бурыцца ад лёгкай «карэкціроўкі» спажыўцоў і заказчыкаў або развальваецца, сустрэўшы непарушную непрабівальнасць вышэйстаячых пастаўшчыкоў і забеспячэнцаў.

У. ТАРАСЕВІЧ,
загадчык аддзела матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння універсітэта.
Запісаў В. МЫШАНЕЦ.

СЛОВА НА РАЗВІТАННЕ

УСЕ ПАЎТАРАЕЦЦА, усё вяртаецца на кругі свае. І зноў ужо ў каторы раз універсітэт выпраўляе чарговы выпуск сваіх выхаванцаў на шырокі прастор самастойнага жыцця. «Бывай, альма матэр!» — скажуць яны ўжо літаральна праз некалькі дзён.

Для многіх пяцікурснікаў гэта не толькі развітанне з універсітэтам, студэнцкім жыццём. Гэта таксама развітанне з літаратурным аб'яднаннем «Узлёт». І таму сённяшні выпуск літаратурнай старонкі газеты з'яўляецца ў некаторай ступені творчай справаздачай узлётаўцаў.

Праз гады нешта забудзецца, сатрэцца ў памяці ўражаннямі ад падзей больш значных і яскравых. Але хто здолее забыць свой паэтычны дэбют, свой першы верш у друкарскім выкананні?! Для многіх узлётаўцаў гэты ўспамін непарыўна звязаны з газетай «Беларускі універсітэт». На працягу пяці гадоў студэнты, якія складаюць сённяшні выпуск «Ружовага ранку», былі актыўнымі аўтарамі газеты. Літаральна ні адзін выпуск літаратурнай старонкі не абыходзіўся без іх удзелу.

Пасля былі ўдалыя спробы пяра ў іншых выданнях. Але сувязь, якая яднала і яднае нашу газету з «Узлётам», з гадамі станавілася яшчэ больш трывалай і плённай. Вялікая заслуга ў тым старасты літаратурнага аб'яднання Сяргея Чыгрына.

У вершах аўтары дзяліліся з равеснікамі сваім болем і клопатамі, шчасцем і роспаччу, выносілі на суд чытачоў свае пачуцці і перажыванні. Можа крыху і недасканалыя ў прафесійным разуменні творы маладых паэтычных галасоў. Але краналі яны сваёй шчырасцю, непасрэднасцю, незвычайнай чысцінёй пачуццяў...

З кожным годам, кожным курсам сталелі студэнты. Разам з імі больш «дарослымі» станавіліся і вершы. Пашыраўся дыяпазон тэм, клопатаў у маладых паэтаў-выпускнікоў Леаніда Трубача, Таццяны Марчык, Сяргея Кавалёва, Валянціны Місюк, Таццяны Каваленкі, Алены Забаронак...

Няма неабходнасці пералічваць зробленае узлётаўцамі за пяць студэнцкіх гадоў ці называць тыя перыядычныя выданні, дзе друкаваліся яны. Не станем прарочыць будучае выпускнікоў. Гэта не так істотна. Галоўнае, што ў час вучобы адбылося выпрабаванне любоўю да роднага слова. Гэты галоўны экзамен члены літаб'яднання «Узлёт» здалі на выдатна. Дык пажадаем ім, як вядзецца: «У добры час!».

В. ГРАМОВІЧ.

Леанід ТРУБАЧ

НА ВЫВАЗЦЫ ЛЕСУ

Вадаспад пілавіння пад ногі
Бела-жоўтым струменіць ручом,
І як знак нечаканай трывогі —
Крык птушыны над чорным карчом.
Парадзелі лясы над Дзвіною
І далёка ад вёскі відаць...
Ці нясеш ты спагаду з сабою,
Каб другому пасля перадаць?
У бязгучным блакітным Сусвеце
Мы шукаем прасцягі вясны...
Адгукаецца ж — восеньскі вецер —
У скалечанай кроне сасны.

* * *

Секунда,
мінута,
гадзіна,
дзень—
Ляцім мы на вашых
спрадвечных хвалях.
За радасцю шчасця — расстання
цень
Не шкадуе вачэй закаханых.

Секунда,
мінута,
гадзіна,
дзень,
І сны — нібы замець лісця
ў адчаі.

Пытанняў сувоі: калі і дзе
Я вясновую кветень спаткаю?..

Секунда,
мінута...
Нястрымны
час
Абрэзаў надзеі крыло дазвання.

Усё ж такі веру: аднойчы й нас
Адшукае світанак кахання!

Сяргей ЧЫГРЫН

СЯБРУ

(Лёню Трубачу)

Ты мой звадыяш да добрага,
Да смешнага і нечаканага.
Вершы з кутка чабаровага
Вобразамі адчаканены.

Пакой наш семсот чацвёрты
Прапах цыбуляй і ліверкай,
Дзе мы ўдваіх употай
Хмялелі жыццём і лірыкай.

Спаць не давала бяссонніца —
Чыталіся тамы...
Будзем да скону помніцца
Свайму факультэту мы!

* * *

Купляюць Джэка Лондана,
Стаяць у чарзе за Мапасанам,
Гюго, Вальтэрам, Дзікенсам.
Ставяць на кніжную паліцу
Творы Маруа, Флабэра, Твена...
А я кожны дзень перачытваю
Купалу —
Я пачынаюся з Купалы.

Таццяна МАРЧЫК

АДНАКУРСНІКАМ

Сустрэліся на зорным рубяжы,
І зорным — ліўні шчасце
варажылі.
Удачы сцеражылі на мяжы
Часовых непаладкаў і...
дружылі.
Расстанне без падману і ілжы,
Не нам цяпер у зорных ліўнях
грэцца.
Мой шумны храм, мой інтэрнат,
скажы,
Калі сустрэцца зноў
нам давядзецца?..
Сустрэчы радасць і балючасць
страт,
І сэрцы пасталеннем
адгукнуцца,
Нам нельга ў беззваротнае
вярнуцца...
І сыплецца ў далоні зоркапад.

* * *

Код жыцця адмервае
дарэмшчыну
Дум, якія халадзяць павекі,
Адплываеш ты па новым
рэчышчы—
Паралельныя бываюць рэкі.
Паралельныя,
несустракальныя,
Недасведчаная невядомасць.
Рэдка я бываю сёння дома.
Разлучаюць нас шляхі
вакзальныя.
Нетаропка будзяць зімы вёсны,
Неадступна ные пачуццё.
Бессустрэчны век мой
з невыноснасцю,
Я бяру цябе ў свае жыццё!

Валянціна МІСЮК

ПТУШКА

Спеў птушкі
Не для вечнасці. Але
Чаму так часам сэрца заклінае,
Каб не глушылі воплескі яе
І пёраў чорна-сініх не зрывалі,
Калі яна, балесная,
Пяе...

Сяргей КАВАЛЕЎ

ШЫПШЫНА

Ці вернемся да вясноў?
Так лёгка яно, так проста
У роднай матулі быць госцем —
У хаце спрадвечных слоў.

Жыццё — залатая вітрына
Праз дым цыгарэт блазнаваты.
А недзе гібела хата,
А недзе чакалі сына.

Балюча шукаю прычыну
І бачу ў спляценні сноў
На снезе халодным —
шыпшыну,
Ці вернемся да вясноў?

Таццяна КАВАЛЕНКА

* * *

Зноў капяжы надзеяй новай
У маё пастукалі акно.
І свет вясны чакання поўны,
І межам шчасця не відно.
І што з таго, што разумення
Ні ў кім я так і не знайшла.
Што боль,
падман,
адчай,
сумненне?..
Вясна ж цяпер, адна вясна!
Падман прабачу і забуду,
Для слёз пакіну толькі сны.
Пакуль жыву, я верыць буду,
І прагнуць новае вясны.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная звязда» МВПА імя Я. Коласа.

20 чэрвеня 1985 г.
Зак. 2636. АТ 13419.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.